**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Банькоўская**

**Алеся Леанідаўна**

# ЖАНОЧЫЯ АСАБОВЫЯ НАМІНАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКІМ ПЕСЕННЫМ ФАЛЬКЛОРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЯСЕЛЬНЫХ ПЕСЕНЬ)

**Дыпломнае даследаванне**

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Мароз С. С.

**Мінск, 2013**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РЭЗЮМЭ

Банькоўская Алеся Леанідаўна

## ЖАНОЧЫЯ АСАБОВЫЯ НАМІНАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКІМ ПЕСЕННЫМ ФАЛЬКЛОРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЯСЕЛЬНЫХ ПЕСЕНЬ)

**Ключавыя словы:** жаночыя асабовыя намінацыі, лексіка-семантычная група, словаўтваральны варыянт, акцэнталагічны варыянт, фанетычны варыянт, варыянты-сінонімы, субстантывацыя, дэмінутыўная форма, канатацыя, збліжэнні.

**Аб'ект даследавання** – намінатыўныя адзінкі, якія абазначаюць асоб жаночага полу ў беларускіх вясельных песнях.

**Прадмет даследавання** – асаблівасці структурна-граматычнай, лексіка-семантычнай структур жаночых асабовых намінацый, спосабы словаўтварэння і стылістычная роля жаночых асабовых намінацый у беларускіх вясельных песнях.

**Мэта даследавання** – комплексна даследаваць намінатыўныя адзінкі, якія абазначаюць асоб жаночага полу ў беларускіх вясельных песнях.

**Метады праведзенага даследавання** – апісальны, часткова супастаўляльны і метад колькасных падлікаў.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што ў дыпломным праекце зроблена спроба ўсебаковага даследавання жаночых асабовых намінацый у беларускіх вясельных песнях: праведзены структурна-граматычны і лексіка-семантычны аналіз, вызначаны асноўныя спосабы словаўтварэння і стылістычная роля жаночых асабовых намінацый.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і асноўныя вынікі дыпломнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры асвятленні тэарэтычных пытанняў па лексікалогіі і дэрываталогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ